Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

*М. М. Забаўскі, А. Ф. Рацько*

# БУРЖУАЗНЫЯ РЭФОРМЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем
па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка
для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца
па спецыяльнасцях: 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны;
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура;
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

*2-е выданне, выпраўленае і дапоўненае*

Мінск
БДПУ
2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# *Глава I.* Аграрныя рэформы: вызваленне сялян і вырашэнне пытання аб зямлі

*(А. Ф. Рацько)*

**1.1. Перадумовы і прычыны адмены прыгону.** Да сярэдзіны XIX ст. у Беларусі склаўся шэраг перадумоў адмены прыгону. Гаспадарка буйных памешчыкаў, у першую чаргу заходніх і цэнтральных губерняў, паступова ўцягвалася ў таварна-грашовыя адносіны. Некаторыя ўладальнікі пачынаюць перабудоўваць яе, уводзячы змены ў апрацоўку зямлі, ужываючы машыны і механізмы, выкарыстоўваючы наёмную працу. Гэта сведчыла аб пранікненні ў панскую гаспадарку новых капіталістычных адносін. Зразумела, што для такіх уладальнікаў вызваленне сялян было не толькі магчымым, але і пажаданым. «Развязаўшыся» са сваімі прыгоннымі, памешчыкі пазбаўляліся неабходнасці клапаціцца аб адказнасці за ўплату дзяржаўных падаткаў, клопату аб сваіх прыгонных падчас голаду і іншых бедстваў. Захаваўшы за сабой зямлю, паны маглі смела глядзець у будучыню. Вопыт суседніх прыбалтыйскіх губерняў, дзе ўжо даўно быў ліквідаваны прыгон, падказваў ім «сацыяльную будучыню». Сяляне, атрымаўшы волю, вымушаны будуць ісці да паноў наймацца на працу.

Аднак большасць беларускіх памешчыкаў па-ранейшаму вяла сваю гаспадарку па-старому. Яны не мелі капіталу для ўвядзення сельскагаспадарчых машын. У іх адсутнічаў досвед у рацыяналізацыі гаспадаркі, і, нарэшце, яны не жадалі ніякіх зменаў. Многія з іх нават не ўсведамлялі самую ідэю ліквідацыі прыгону. Ва ўмовах пашырэння таварна-грашовых адносін сярэднія і дробныя памешчыкі дзеля павелічэння колькасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў сваіх маёнтках павялічвалі фальваркавыя ўгоддзі, абеззямельваючы прыгонных, узмацнялі эксплуатацыю сялян і тым самым падрывалі іх гаспадарку. Зніжэнне ўраджайнасці на сялянскіх землях, павелічэнне недоімак, запазычанасць памешчыкаў, памяншэнне колькасці сялянскага насельніцтва – усё гэта сведчыла аб неэфектыўнасці прыгонніцкай сістэмы.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

# ЗМЕСТ


**Уводзіны (М. М. Забаўскі, А. Ф. Рацько)** ..................................................... 3
**Глава I. Аграрныя рэформы: вызваленне сялян і вырашэнне пытання аб зямлі (А. Ф. Рацько)** .................................................................................... 8
1.1. Перадумовы і прычыны адмены прыгону ........................................ 8
1.2. Рэскрыпт Віленскаму генерал-губернатару У. І. Назімаву ................ 12
1.3. Губернскія камітэты. Рэдакцыйныя камісіі ...................................... 1[illegible]
1.4. Маніфест і «Палажэнні» ад 19 лютага 1861 г. Прававое становішча сялян. Надзелы і павіннасці ............................................................... 22
1.5. Выкупная аперацыя. Устаўныя граматы ........................................ 26
1.6. Змены ў «Палажэннях» у сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. ........... 29
1.7. Рэформы для дзяржаўных сялян, вольных людзей, сельскіх чыншавікоў і іншых катэгорый сялянскага насельніцтва ......................................... 34
**Глава II. Палітычныя і культурна-адукацыйныя рэформы ў другой палове XIX ст. (М. М. Забаўскі)** ...................................................... 41
2.1. Увядзенне мясцовага самакіравання ................................................ 41
2.2. Рэформы суда і арміі ....................................................................... 43
2.3. Гарадская рэформа .......................................................................... 46
2.4. Школьная рэформа .......................................................................... 47
2.5. Цэнзурная рэформа .......................................................................... 52
**Глава III. Палітычныя рэформы ў Беларусі ў пачатку XIX ст. (М. М. Забаўскі)**... 54
3.1. Змяненні ў палітычнай сітуацыі ў беларуска-літоўскіх землях у пачатку XX ст. ..................................................................................... 54
3.2. Сталыпінская аграрная рэформа ..................................................... 60
3.3. Трэццячэрвеньская палітычная сістэма. Увядзенне земстваў у заходніх губернях ............................................................................................. 65
**Глава IV. Адносіны да праблем рэфармавання краіны ў праграмах і дзейнасці палітычных партый у Беларусі ў міжрэвалюцыйны перыяд (1907–1917 гг.) (М. М. Забаўскі)** ..................................................... 70
4.1. Манархічныя сілы ў грамадска-палітычным жыцці ......................... 70
4.2. Кадэты і прагрэсісты ....................................................................... 75
4.3. Яўрэйскі ліберальны рух .................................................................. 80
4.4. Дзейнасць акцябрыстаў .................................................................... 82
4.5. Ліберальны варыянт заходнерусізму ............................................... 85
4.6. Польскі грамадска-палітычны рух .................................................... 89
4.7. Газета «Наша ніва» ........................................................................... 90
4.8. Партыі сацыялістычнай арыентацыі ................................................ 92
**Заключэнне (М. М. Забаўскі, А. Ф. Рацько)** ............................................ 96
**Прыклады тэставых заданняў** ................................................................ 102
**Літаратура** ................................................................................................ 105
**Дадаткі** ..................................................................................................... 109


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ